Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
_____________Корбут А.А.
_5_ _снежня_ 2018 г.

Рэгістрацыйны № ВД-_3003_/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СВЯТОЧНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**

1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках)

2018 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі ОСВО 1-17 01 15-2013 па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках), вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-02 Рэжысура свят (тэатралізаваныя), рэгістрацыйны № С 17-1-53/15 вуч. 22.06.2015

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*А. А. Гулак*, дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук;

*А. Я. Камінскі*, дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

*А. Г. Фядотаў*, дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Т. В. Валодзіна*, загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі» філіяла «Інстытут мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклору імя Кандрата Крапівы», доктар філалагічных навук;

*А. М. Нароўская*, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 22.05.2016);

Прэзідыўмам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 14.12.2017)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. А. Гулак

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Святочная культура Беларусі» – адна з асноўных у праграме падрыхтоўкі рэжысёра свят. Вывучэнне народных абрадаў і свят каляндарнага і сямейнага цыклу, традыцыйнай і сучаснай святочнай культуры Беларусі, узаемадзеяння традыцый і навацый мае практычную неабходнасць, з'яўляецца актуальным і сацыяльна значным.

Вучэбная дысцыпліна «Святочная культура Беларусі» ставіць мэту ўсебаковага вывучэння традыцыйнай культуры нашага народа, яе светапоглядных асноў, каштоўнасных арыентыраў, спецыфічна этнічных характарыстык, адметных рыс і рэгіянальных асаблівасцей. Важнае значэнне надаецца раскрыццю шляхоў стварэння сучасных свят на аснове і з улікам пераемнасці культурна-гістарычных традыцый.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

- вывучэнне сістэмы свят і абрадаў як неад'емнай часткі традыцыйнай народнай культуры;
- раскрыццё генетычнай асновы і тэндэнцый развіцця традыцыйных і сучасных свят;
- выяўленне працэсаў пераемнасці, зменлівасці і ўстойлівасці абраднасці беларусаў;
- фарміраванне ўсвядомленай мастацка-рыжысёрскай культуры спецыяліста ў галіне рэжысуры свят.

У сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй вучэбная дысцыпліна «Святочная культура Беларусі» звязана з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі: «Этнаграфія, міфалогія і фальклор беларусаў», «Музычна-шумавое вырашэнне свята», «Пластыка-харэаграфічнае вырашэнне свята», «Моўнае дзеянне ў свяце», «Рэжысура свят».

Праграма вучэбнай дысцыпліны «Святочная культура Беларусі» прадугледжвае фарміраванне ў будучага спецыяліста ў галіне святочнай культуры акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый.

Да *акадэмічных кампетэнцый* належаць:

- умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;
- умець працаваць самастойна;
- быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю);
- умець вучыцца, самастойна павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

Да *сацыяльна-асобасных* кампетэнцый належаць:

- валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый;
- умець працаваць у камандзе;
- быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і сусвету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

Да *прафесійных* кампетэнцый належаць:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– ажыццяўляць работу пастановачных груп па арганізацыі і правядзенню розных форм святочнай культуры;
– арганізоўваць работу творчых калектываў падчас правядзення свят для дасягнення пастаўленых мэт і задач;
– рэалізоўваць агульнадзяржаўныя, рэгіянальныя і ведамасныя праграмы і праекты ў галіне культуры;
– выкарыстоўваць нарматыўна-прававую базу галіны культуры;
– праводзіць культурна-асветніцкія мерапрыемствы для выхавання мастацка-эстэтычнага густу ўсіх катэгорый насельніцтва ва ўстановах культуры, спорту і адукацыі і іншых установах;
– кансультаваць кіраўнікоў і ўдзельнікаў творчых, спартыўных, ваенных і іншых калектываў падчас падрыхтоўкі творчых праектаў;
– праводзіць адбор рэпертуару мастацкіх твораў з мэтай захавання і трансляцыі народнай творчасці;
– распрацоўваць і ўвасабляць праекты розных святочных форм;
– выкарыстоўваць новыя накірункі ў сучасных рэжысёрскіх тэхналогіях;
– ладзіць арганізацыю і правядзенне маштабных фестываляў на адкрытай пляцоўцы, прысвечаных актуальным пытанням сучаснага грамадства;
– ажыццяўляць навукова-эксперыментальную работу ў галіне рэжысуры свят.

Колькасць аўдыторных гадзін на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Святочная культура Беларусі» складае 132, з іх лекцый – 94, практычных – 14, семінарскіх – 20, індывідуальных – 4 гадзіны. Форма бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне – залікі і экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## УВОДЗІНЫ

Паняцце *святочная культура.* Свята як універсальны феномен народнай традыцыі. Свята – сакральны час проціпастаўлены штодзённасці. Усеагульнасць і масавасць як важнейшы прынцып народнага свята.

Сучасныя фундаментальныя даследаванні ў галіне беларусазнаўства. Шматтомнае выданне «Беларусы». У плане вывучэння святочнай культуры актуальныя Т. 7 – «Вусная паэтычная творчасць", Т. 9 – «Антрапалогія» (2006), Т. 10 – «Славянскія этнакультурныя традыцыі" (2007). Акадэмічнае даследаванне ў 6 кнігах з серыі «Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка»: «Каляндарна-абрадавая паэзія», «Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр» (абедзве 2001), «Пазаабрадавая паэзія» (А. Гурскі, Г. Пятроўская, Л. Салавей), «Народная проза» (К. Кабашнікаў А.Фядосік, А. Цітавец, абедзве 2002), «Міфалогія. Духоўныя вершы» (2003), «Малыя жанры. Дзіцячы фальклор» (2004). Энцыклапедыя «Беларускі фальклор» (2005–2006). Серыя «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» у 6 тамах (10 кнігах) (2008–2013). Аўтэнтычнасць тэкстаў, дакладная перадача дыялектных асаблівасцяў і індывідуальнай манеры гаворкі інфармантаў, увага да кантэксту і асабістых перажыванняў носьбітаў традыцыі, шырокі рэгіянальны ахоп матэрыялаў стварае аб'ёмную панараму існавання беларускай традыцыйнай культуры на сучасным этапе. Публікацыя рэгіянальных фальклорных зборнікаў. Падручнікі для ВНУ.

## ТЭМА 1. АДЛЮСТРАВАННЕ АРХАІЧНЫХ КУЛЬТАЎ І ВЕРАВАННЯЎ У СВЯТОЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

Анімізм – удухаўленне аб'ектаў навакольнага свету. Анімістычная аснова *гукання вясны, прывітання нівы, абрадаў Куст, Пахаванне стралы, Дажынкі, абрадаў пераносу свячы* ў Цэнтральнай Беларусі і на Падняпроўі і інш. Народная дэманалогія. Фетышызм – вера ў звышнатуральныя якасці прадметаў прыроднага (*камяні-валуны, «пяруновыя стрэлы», жытні сноп, яйка, вярба, траецкі «май», мак* і інш.) ці культурнага паходжання (*крыж, грошы, ручнікі, элементы адзення, ежы, вырабы з жалеза* і інш.).Татэмізм – сістэма рытуалаў і табу, звязаная з верай у роднасць, паходжанне групы людзей (роду, сям'і, клана) ад пэўнага віду жывых істот ці раслін. Вобразы татэмістычнага паходжання ў святочна-абрадавай культуры: *мядзведзь, воўк, каза, бусел, вуж.*

Культ продкаў як комплекс міфалагічных уяўленняў пра пасмяротнае існаванне душ памерлых (дзядоў), ушанаванне іх на працягу гадавога цыкла. Семантыка культа продкаў у кантэксце сямейных, асобных каляндарных абрадаў. Сакральнае стаўленне да зямлі – адной са стыхій светаўтварэння (разам з вадой, паветрам і агнём). Праявы культа агню ў народнай культуры: купальскі, перуноў, агонь свечкі (*грамнічная, чацвярговая, велікодная,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*вянчальная*), хатні агонь (*абрад «Жаніцьба коміна»*). Праявы культа вады ў народнай культуры: *пакланенне крыніцам, вада ў магічных, лекавых практыках, раса, абрад Вадохрышча.* Увасабленне культа зеляніны ў велікоднай, юр'еўскай, траецка-купальскай, вясельнай абраднасці.

## ТЭМА 2. НАРОДНЫ КАЛЯНДАР ЯК КОМПЛЕКС ТРАДЫЦЫЙНЫХ ВЕРАВАННЯЎ І АБРАДАВЫХ ПРАКТЫК

Народны каляндар як сінтэз адносна аўтаномных мадэляў: распарадку хрысціянскіх свят, пастоў, мясаедаў; каляндароў сонечнага, месяцовага і вегетатыўнага; земляробчага, жывёлагадоўчага, прадзільна-ткацкага, пчалярскага і інш.; шлюбнага і памінальнага; дэманалагічнага (сезоннасць з'яўлення міфалагічных персанажаў) і фальклорнага (каляндарныя рэгламентацыі спеваў, загадвання загадак і інш.). Каляндарныя абрады як сакральна-магічны комплекс, у склад якога ўваходзяць славесныя, песенныя, гульнявыя, драматычныя і харэаграфічныя жанры.

Прыказкі і прыкметы народнага календара.

## ТЭМА 3. РУХОМЫЯ І НЕРУХОМЫЯ СВЯТЫ. ПРЫСВЯТКІ

Асноўныя звесткі з гісторыі календара. Юліянскі і грыгарыянскі стыль летазлічэння. Рухомыя (пасхацэнтрычныя) святы: адлік па тыднях. *Масленіца, Вербная, Вялікдзень, Радаўніца, Ушэсце, Тройца* і інш. Нерухомыя святы: *Каляды, Стрэчанне, Благавешчанне, Юр'е, Купалле, Пятра і Паўла, Ілля, Спасы, Багач, Уздзвіжанне, Пакровы, Дзяды* і інш. Назвы, даты і характар адзначэння ў традыцыях праваслаўных і каталікоў. Прысвяткі: *Увядзенне, Варвары, Саракі, Аўдакей, Мікола Веснавы, Іван-Галавасек, Варвары, Мікола Зімовы* і інш. Метэаралагічныя і гаспадарчыя прыкметы да прысвяткаў.

## ТЭМА 4. НАРОДНАЯ БІБЛІЯ ЯК ФЕНОМЕН ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ

Народная Біблія як комплекс сюжэтаў фальклорных твораў, у якім спалучаюцца элементы хрысціянскай кананічнай, апакрыфічнай і народнапаэтычнай традыцый. Народнахрысціянскія паняцці і ўяўленні цесна звязаны з гаспадарчай дзейнасцю чалавека (земляробствам і жывёлагадоўляй) і выражаюцца ў народным календары, народнай дэманалогіі, медыцыне, метэаралогіі і інш. Трансфармацыі вобразаў хрысціянскіх святых у народнай культуры: *Мікалай Цудатворца, Ілля-прарок, Георгій Пераможац, Улас, Касьян, Параскева-Пятніца, Пётр і Павел.* Інтэрпрэтацыя хрысціянскіх рытуалаў: народнае святкаванне *Ражства, Пасхі.* Народная этымалогія назваў свят: *Стрэчанне, Благавешчанне, Саракі, Юр'е, Ілля, Спас, Уздзвіжанне, Пакровы* і інш. Традыцыі фэстаў (храмавых свят).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМА 5. УВАСАБЛЕННЕ НАРОДНАЙ МАРАЛІ І ЭТЫКІ Ў СВЯТОЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

Усеагульнасць свята: прысутныя – удзельнікі. Маральна-этычныя нормы святочнай культуры: *запрашэнне, прывітанне, гасціннасць, дзякаванне, развітанне, праводзіны, павага да чужога жытла. Шанаванне талакі*. Павага да бацькоў, свайго роду (*запытанне дазволу, благаслаўленне* і інш.), значэнне думкі сялянскага соцыуму. Узроставая і гендарная іерархія: *калядаванне, шчадраванне, валачобніцтва*.

Радзінная абраднасць як комплекс традыцыйных звычаяў і абрадаў, скіраваных на прынящце нованароджанага ў сям'ю, род, далучэнне да хрысціянскай царквы і забеспячэнне шчаслівай будучыні. Вяселле – комплекс абрадаў, што рэгламентавалі стварэнне новай сям'і і новых роднасных сувязей (*Пярэзвы, Гасціны* і інш.).

## ТЭМА 6. ГЕНДАРНЫ АСПЕКТ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ

Універсальная бінарная апазіцыя традыцыйнай культуры – *мужчынскі/жаночы*. Сакральная сувязь жаночага пачатку са сферай плоднасці, урадлівасці, маці-зямлі. Вызначальная роля жанчын ў каляндарных абрадах. «Жаночыя» абрады і магічныя практыкі (*Адведкі, Гуканне вясны, Провады русалкі, Пахаванне стралы, жніўная абраднасць, абворванне, выраб абыдзённіка, замовы*). Прадзенне і ткацтва. Сакральная сувязь мужчыны з апладняльным, стваральным пачаткам. «Мужчынскія» абрадавыя дзеянні, скіраваныя на сувязь са светам продкаў (*кліканне мароза на куццю, дзядоў на вячэру, валачобніцтва*). Земляробства, кавальства ганчарства, гранне на музычных інструментах. Гендарныя стэрэатыпы народнай культуры адносна нараджэння ў сям'і хлопчыка і дзяўчынкі. Прыкметы, звязаныя з полавай дыферэнцыяцыяй.

## ТЭМА 7. СЯМЕЙНЫЯ І КАЛЯНДАРНЫЯ СВЯТЫ Ў СПІСЕ АБ'ЕКТАЎ НКС

*Мінская вобласць:* калядны абрад «Цары» в. Семежава Капыльскага раёна; абрад «Цягнуць Каляду на дуба» в. Новіны Бярэзінскага раёна; абрад «Переанос Міхайлаўскай свячы» а/г. Вяляцічы Барысаўскага раёна.

*Брэсцкая вобласць*: вясельная каравайная традыцыя в. Моталь Іванаўскага раёна; абрад «Намскі Вялікдзень» в. Аброва Івацэвіцкага раёна; вясновы абрадавы карагод «Стрылка» в. Бездзеж Драгічынскага раёна; абрад ваджэння Куста на другі дзень Тройцы а/г Лобча Лунінецкага раёна.

*Віцебская вобласць*: абрад «Жаніцьба Цярэшкі» Лепельскага раёна; Масленічная абрадавая гульня «Пахаванне Дзеда» Гарадоцкага раёна; абрад «Насіць намётку» в. Папшычы Глыбоцкага раёна.

*Гомельская вобласць*: абрад «Юр'е» (абрад «Тураўскі карагод» на свята Юр'е) в. Пагост Жыткавіцкага раёна; абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

в. Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна; абрад «Провады русалкі» в. Вялікі Бор Хойніцкага раёна; абрад гукання вясны «Чырачка» а/г. Тонеж Лельчыцкага раёна.

*Гродзенская вобласць*: абрад «Юр'е» в. Ахонава Дзятлаўскага раёна.

*Магілёўская вобласць*: абрад «Варварынская свяча» в. Басценавічы Мсціслаўскага раёна.

## Раздзел ІІ. Фальклорныя жанры ў кантэксце святочнай культуры беларусаў

### ТЭМА 8. ПЕСНІ КАЛЯНДАРНЫХ АБРАДАЎ

Песні каляндарных абрадаў па функцыянальнай прымеце. Зімовыя: *піліпаўскія, калядныя і шчадроўскія, цярэшкі, масленічныя (запусныя)*. Вясновыя: *песні-вяснянкі, валачобныя, юр'еўскія, траецкія (сёмушныя), куставыя, русальныя, песні веснавой талакі, песні да веснавых карагодаў і гульняў*. Летнія: *касецкія, купальскія, пятроўскія, песні да летніх карагодаў, жніўныя*. Восеньскія: *ярынныя, ільняныя, талочныя*.

Міфасемантыка песень каляндарных абрадаў. Паэтызацыя прыроды, працы і дабрабыту земляроба. Увасабленне гаспадарчага і метэаралагічнага вопыту народа. Песні каляндарных абрадаў паводле жанравай прыроды: *заклінальныя, велічальныя, жартоўныя, лірычныя, эпічныя*.

### ТЭМА 9. ПЕСНІ СЯМЕЙНЫХ АБРАДАЎ

Сямейныя абрады як складаны сакральна-магічны комплекс, у склад якога ўваходзяць песенныя, славесныя, гульнявыя і харэаграфічныя жанры. Жанравае багацце песень радзіннага і вясельнага абрадаў. Радзінныя і вясельныя песні паводле жанравай прыроды: *заклінальныя, цырыманіяльна-рытуальныя, велічальныя, лірычныя, сатырычна-гумарыстычныя, прыпеўкі*. Адлюстраванне абрадавых дзеянняў у тэкстах песень. Матывы, вобразы і паэтычныя сродкі. Паэзія пахавальнай абраднасці паводле жанравай прыроды: *галашэнні, псалмы, духоўныя вершы*. Імправізацыйная прырода галашэнняў. Увасабленне культа продкаў, сямейных і родавых каштоўнасцей. Народная мараль і этыка ў песенных творах гэтай групы.

### ТЭМА 10. ПАЗААБРАДАВЫЯ ПЕСНІ: ЖАРТОЎНЫЯ, ПРА КАХАННЕ, ПРЫПЕЎКІ, БАЛАДЫ

Песня ў народным свяце. Песня – універсальны лірычны жанр фальклору. Класіфікацыя пазаабрадавых песень. *Жартоўныя песні*: гуманізм і жыццясцвярджальны пафас. Мастацкія прыёмы стварэння камічнага: гратэск, кантраст, паўторы, пералічэнні, выклічнікі. *Песні пра каханне*: лірызм, ідэалізацыя вобразаў, паэтызацыя пачуцця. Асноўныя сюжэтныя матывы. *Прыпеўкі*: жартоўны характар, сувязь з музыкай і танцам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нечаканасць камічнай развязкі як асноўны кампазіцыйны прыём. *Балады* як ліраэпічны жанр: элементы цудоўнага, сямейна-бытавы ці маральна-этычны канфлікт, трагізм сюжэта. Купальскія балады. Народная мараль ў пазаабрадавай песні.

## ТЭМА 11. СЛАВЕСНЫЯ ЖАНРЫ: КАЗКІ, ЛЕГЕНДЫ, ПАДАННІ, БЫЛІЧКІ

Славесныя жанры фальклору: спосаб мастацкага адлюстравання і асэнсавання рэчаіснасці. Казкавая проза: *казкі пра жывёл, чарадзейныя, бытавыя* (сацыяльна-бытавыя і навелістычныя). Алегарычнасць як аснова вобразнай сістэмы казак пра жывёл. Трансфармацыя архаічнага канфлікту чалавека і сіл прыроды ў сацыяльны або бытавы канфлікт у чарадзейнай казцы. Сацыяльныя адносіны, сялянскі побыт і народныя маральна-этычныя нормы ў бытавых казках. Казкі-небыліцы.

Няказкавая проза: *легенды, паданні, сказы, былічкі (прымхліцы)*. Інфарматыўная функцыя як вызначальны фактар няказкавай прозы. Легенды паводле гісторыка-тэматычнага прынцыпу: *этыялагічныя (касмаганічныя, зааганічныя), духоўна-этычныя, гісторыка-культурныя, дэманалагічныя.* Светапоглядны дуалізм легенд. Прынцыпы гуманізму і народнай этыкі ў легендах. Паданні паводле тэматычнага прынцыпу: *гістарычныя, тапанімічныя* і інш. *Былічка* (*прымхліца*) як аднаэпізоднае апавяданне пра кантакт чалавека са звышнатуральным, якое мае ўстаноўку на сапраўднасць (апісанне рэальнай штодзённасці).

Выкарыстанне сюжэтаў і вобразаў славесных жанраў фальклору (народнай прозы) ў рэжысёрскай і сцэнарнай працы.

## ТЭМА 12. МАЛЫЯ СЛАВЕСНЫЯ ЖАНРЫ: ПРЫКАЗКІ, ПРЫМАЎКІ, ЗАМОВЫ, ЗАГАДКІ

Паходжанне малых устойлівых славесных форм і віды: *прыказкі, прымаўкі, замовы, загадкі* а таксама *павер'і, прыметы, прыгаворкі, тосты-зычанні* і інш. *Прыказкі* як увасабленне народнай мудрасці, жыццёвага вопыту і маральна-этычных норм. Афарыстычнасць, разнастайнасць тэматыкі. Класіфікацыя. *Прымаўкі* як устойлівыя выслоўі, якія вобразна характарызуюць аб'ект. Суаднесенасць прымавак з пэўнымі часцінамі мовы. Праблема літаратурнага перакладу малых славесных форм. Унікальнасць і архаічнасць *замоў*. Носьбіты замоў і асаблівасці бытавання. Знахарства і чарадзейства. Хрысціянская сімволіка ў замовах. Замовы паводле тэматычнага прынцыпу: *гаспадарчыя, ахоўныя, лекавыя, звязаныя з сацыяльным і сямейным бытам*. Анімістычная аснова *загадак*. Этнаграфізм. Багацце жанравых форм загадак (*сказы, пытанні, жарты, задачы*).

Выкарыстанне ўзораў малых славесных форм у рэжысёрскай і сцэнарнай працы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМА 13. ГУЛЬНЁВА-ХАРЭАГРАФІЧНЫЯ ЖАНРЫ

Тэрміналагічнае размежаванне паняццяў *гульні, забавы* і *ігрышчы.* Ігрышча *«Жаніцьба Цярэшкі»* Лепельскага раёна Віцебскай вобласці. Масленічная абрадавая гульня *Калодка. Гульня «Пахаванне Дзеда»* Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці. Велікодныя гульні: *качанне яек, у біткі, Крумкач.* Масавыя гулянні на Юр'е, Тройцу і Купалле. Восеньскае ігрышча *Ката пячы.* Універсальныя каляндарныя гульні *Явар, Юрачка, Падушачка, Цяцерка.* Гульні ў кантэксце хрэсьбінаў і вяселля.

Архаічнасць харэаграфічнага жанру *карагод.* Карагоды песенныя, гульнявыя, танцавальныя. Познетрадыцыйныя танцы: арнаментальныя, імправізаваныя, танцы-гульні. Танцы гуртавыя (*Мяцеліца, Грачанікі, Акуліна,* кадрыліна 2, 4, 6, 8 пар, танцы ўпяцёх, тройкамі); парныя (*Лявоніха,* полька-*Бабачка, Кракавяк, Падэспань, Какетка, Война*), сольныя (*Мікіта, Каза, Рускага, Жабкі, Цыганачка*) і інш.

Раздзел III. Акцыянальнасць святочнай культуры беларусаў

## ТЭМА 14. ДРАМАТУРГІЯ НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

Драматургія *фальклорна-этнаграфічных комплексаў* (калядныя абыходы, радзіны, вяселле і інш.) Прастора і час. Традыцыйныя ролі. Выканаўцы. Касцюмы і маскі. Рэгламентацыя паводзінаў. Абавязковыя і імправізаваныя дыялогі.

Драматургія маладзёжных і дзіцячых гульняў. Элементы тэатралізацыі пры выкананні *казак.* Паўтаральнасць дзеянняў у *карагодных гульнях.* Тэатральна-драматычныя прадстаўленні падчас *кірмашоў* і *святаў.*

Культурныя вытокі беларускай *батлейкі* і яе нацыянальная самабытнасць. Віды батлейкі, носьбіты традыцыі. Тэатральны рэквізіт. Рэлігійная частка батлейкі. Народныя драмы «Цар Максімілян» і «Цар Ірад». Інтэрмедыі ў складзе школьнай біблейска-евангельскай драмы. Антытэза рытарычнага і камічнага. Фалькларызм інтэрмедый. Вобраз селяніна.

## ТЭМА 15. МАГІЧНЫЯ ПРАКТЫКІ Ў СВЯТОЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

Засцерагальныя, мантычныя практыкі (варожбы), ахвярапрынашэнні– істотныя кампаненты традыцыйнай духоўнай культуры, шырока распаўсюджаныя ў культуры сялянскай супольнасці. Ахвярапрынашэнні ў крызісных жыццёвых сітуацыях: выраб *ручніка-абыдзённіка.* Ахвяраванні на храм: *брацкая свечка, воты, грошы.* Ахвяраванні духам лесу і воднай прасторы. Ушанаванне месцаў пахавання, святых крыніц, камянёў, прошчаў. Абрад «Намскі Вялікдзень» в. Аброва Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Традыцыя паломніцтва і ўшанавання Блакітнай крыніцы Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прадказанні надвор'я, росту і выспявання раслін, суадносна са станам прыроды на свята ці прысвятак (Грамніцы, Благавешчанне, Юр'е, Пятра і Паўла, Ілля, Пакровы і інш.). Перыяд зімовага і летняга сонцавароту (Каляды і Купалле): варожбы гаспадарчыя (на ўраджай розных культур, прыплод жывёлы і інш.) і сямейна-бытавыя (на шлюб). Практыкі кумавання і завівання вянкоў, бяроз на Тройцу. Абрадавыя дзеянні этапу заканчэння жніва: завіванне барады. Засцерагальныя практыкі ў кантэксце радзінна-хрэсьбіннай абраднасці, вяселля і пахавання.

## ТЭМА 16. ПРЫГАТАВАННЕ І ЎЖЫВАННЕ АБРАДАВАЙ ЕЖЫ

Абрадавая ежа – складовая частка сямейных, каляндарных, гаспадарчых і аказіянальных абрадаў, прыгатаванне і ўжыванне якой рэгламентуецца сацыяльнымі нормамі і традыцыйнымі звычаямі. Сакральны характар абрадавай ежы: *куцця, пасха, яйкі, каравай, бабіна каша*. Рытуалізацыя прыгатавання абрадавай ежы: каравайны абрад. Вясельная каравайная традыцыя в. Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Рытуалізацыя спажывання абрадавай ежы: вызначальная роля гаспадара хаты і гаспадыні, мыццё рук, малітва, славесныя формулы, пакіданне абрадавай ежы на стале, скармліванне жывёле, захоўванне.

## ТЭМА 17. ПЕРААПРАНАННЕ І МАСКАВАННЕ Ў СВЯТОЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

Пеараапрананне і маскаванне – складовая частка сямейных і каляндарных абрадаў. Міфалагічная семантыка маскі як сувязь чалавека з іншасветам у рытуальных засцерагальных і прадуцыравальных дзеяннях. Сувязь персанажаў-масак з татэмізмам, фетышызмам і культам продкаў. Калядныя (шчадроўскія) персанажы-маскі: *каза, мядзьведзь, жуќравель, кабыла, дзед, шчодра, цыган, смерць*. Калядны абрад «Цары» в. Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Абраднасць Куста ў Заходнім Палессі. Элементы пераапранання і маскавання ў радзінна-хрэсьбінным і вясельным абрадзе.

## Раздзел IV. Святочная культура Беларусі XIV–XIX стст. і новага часу

## ТЭМА 18. ПАРАТЭАТРАЛЬНЫЯ ДЗЕІ ШЛЯХЕЦКАГА САСЛОЎЯ

Складанасць працэса саслоўнага афармлення беларускай шляхты ў XIV –XVI стст. Сістэма каштоўнасцей (*рэлігійная самасвядомасць, этычныя нормы, эстэтычныя густы*), на аснове якіх фарміравалася культура шляхецкага саслоўя. Важная культураствараючая функцыя ў разглядаемую эпоху належыць рэлігіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вытокі і развіццё на розных гістарычных этапах паратэатральных дзей шляхецкага саслоўя. Віды: *тэатралізаваныя шэсці, піры, паляванні, сустрэча каранаваных асоб, пахаванні.* Структура, выразныя сродкі і семантыка дзей канфесійных і свецкіх тэатралізаваных шэсцяў, абрадаў. Асаблівасці, выразныя сродкі і кампазіцыйная пабудова імянін, дзён нараджэнняў і вяселляў прадстаўнікоў беларускай шляхты. Рытуальныя сустрэчы каранаваных асоб, магнатаў. Тэатралізаваныя дзеі паляванняў.

## ТЭМА 19. СВЯТОЧНАЯ КУЛЬТУРА СТАРАЖЫТНАГА ГОРАДА

Генезіс прафесійных свят. Старажытныя формы прафесійных свят і іх структура. *Святы цэхавых рамеснікаў*, прысвечаныя святым патронам асобных карпарацый. *Кузьма* і *Дзям'ян* – апякун кавалёў, *Пётр* і *Павел* – апякун рыбаловаў і інш.

*Адзінаборствы* ў кантэксце святочнага жыцця старажытнага беларускага горада. Паходжанне і тэндэнцыі развіцця спартыўных гульняў. Баявыя практыкаванні і адзінаборствы як спосаб ваеннай падрыхтоўкі. *Рыцарскія турніры*: змест, умовы паядынкаў, мастацка-дэкаратыўнае вырашэнне, артыбутыка. Традыцыі правядзення турніра «Кароль курка» ў Слуцку, Нясвіжы, Быхаве (сярэдзіна XVII–XVIII ст.). *Конныя каруселі* ў замках і кадэцкіх корпусах Нясвіжа, Слуцка, Шклова, Гродна. Рытуал адкрыцця, мастацкае афармленне, гульнявы змест конных каруселяў. *Кірмашовыя спартыўныя забавы.* Значэнне традыцый гарадской культуры Беларусі.

## ТЭМА 20. СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ САВЕЦКІХ МАСАВЫХ СВЯТ

Савецкая каляндарная рэформа 1918 г. Чырвоны каляндар. Класіфікацыя свят ў СССР. *Дэманстрацыі* і *маёўкі* ў 1920–30-я гг. у Мінску, Віцебску, Магілёве, Гомелі. Дзейнасць К. Малевіча, М. Шагала, Ю. Пэна па афармленні гарадской прасторы Віцебска. Традыцыі і спецыфіка святкавання дат савецкай гісторыі. *Дэманстрацыі, мітынгі, шэсці, канцэрты, жывыя карціны, імправізаваныя суды, тэатралізаваныя карнавалы, харавыя дэкламацыі* як формы паяднання інфармацыйна-прапагандысцкага матэрыялу з мастацкай вобразнасцю.

Новыя формы масавых урачыстасцяў 1940–70-х гг. Віды *фестываляў. Дэкады нацыянальнага мастацтва. Святы прафесій.* Дзіцячыя, юнацкія і моладзевыя святы. *Тэатралізаваныя мастацка-спартыўныя прадстаўленні і інсцэніроўкі.* Сінтэтычны характар як вызначальная рыса новых форм масавых урачыстасцяў.

## ТЭМА 21. АФІЦЫЙНЫ СВЯТОЧНЫ КАЛЯНДАР БЕЛАРУСІ

Гісторыя, сэнс і структура дзяржаўных свят. Кампаненты абрадава-рытуальнай часткі: *вынас сцягоў, дзяржаўнай сімволікі, ганаровы караул,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*святочнае шэсце, парад, мітынг, ускладанне кветак да мемарыяльных месцаў і месцаў пахаванняў, цырымонія ўрачыстага адкрыцця і закрыцця свята, урадавы канцэрт, святочны салют* і інш. Узбагачэнне сродкаў святочнай відовішчнасці і афармлення. Дзяржаўная і гістарычная сімволіка ў сучасных святах.

Ваенна-патрыятычныя святы. Характарыстыка відовішчных форм: *шэсце, парад, дэманстрацыя, гістарычная рэканструкцыя, фестывалі* і інш.

Святкаванне *юбілеяў заснавання беларускіх гарадоў*. Прастора і час свята. Асноўныя сімвалы свята: *герб, сцяг, гімн*. Паліфанічнасць святочнага дзеяння. Гісторыя горада, лёс яго жыхароў і гістарычны ландшафт – аснова рэжысёрскай задумы. Афіцыйныя мерапрыемствы. Структура абрадаў і цырымоній. Рэкрэацыйная прастора горада і яе напаўненне тэатралізаванымі і відовшчнымі элементамі.

Святкаванне *юбілеяў выдатных дзеячаў культуры, памятных дат*. Памятныя даты ААН: *спецыяльныя дні, тыдні, гады і дзесяцігоддзі*, прысвечаныя пэўнай тэме ці праблематыцы.

*Прафесійныя дні* і *святы. Карпаратыўныя святы.* Выкарыстанне спецыфічных знакаў і сімвалаў. Правядзенне традыцыйных і распрацоўка новых абрадава-рытуальных дзей.

## ТЭМА 22. ВІДЫ І ФОРМЫ СУЧАСНЫХ МАСТАЦКА-ВІДОВІШЧНЫХ ДЗЕЙ

Новыя формы мастацкіх відовішчаў: *маладзёжныя шоу-праграмы, дзіцячыя святы з гульнявой асновай, рэгіянальныя праграмы і праекты, анімацыйныя праграмы і шоу, тэатралізаваныя гульнявыя праграмы.*

*Вулічны тэатр*: выкарыстанне ў сучаснай святочнай культуры. Рэжысура вулічных прадстаўленняў. Выкарыстанне гарадскога або прыроднага асяроддзя як мастацкага кампанента. Прыёмы работы з гледачом.

*Тэатралізаваныя шэсці* і *карнавалы*: структура і выразныя сродкі (музыка і танец, касцюміраванне, маскі і лялькі). Сродкі руху ўдзельнікаў (хадулі, веласіпеды, платформы, аўтамабілі). *Перформансы, акцыі, флэш-мобы, хэпенінгі*: тэатральны пачатак і відовішчнасць. Выкарыстанне падчас правядзення карпаратыўных масавых свят, у гістарычных рэканструкцыях, рэкламных акцыях. *Мультымедыйнае шоу* як сінтэз святла, гуку, агню, вады, лазэрнай графікі, відэа і слайд-праекцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Колькасць адзін СРС | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Індывідуальныязаняткі | | |
| | Уводзіны | 4 | 4 | | | | | |
| | Раздзел I. Храналогія і семантыка святочнай культуры беларусаў | | | | | | | |
| 1. | Адлюстраванне архаічных культаў і вераванняў у святочнай культуры | 6 | 4 | | 2 | | | |
| 2. | Народны каляндар як комплекс традыцыйных вераванняў і абрадавых практык | 6 | 4 | | 2 | | | |
| 3. | Рухомыя і нерухомыя святы. Прысвяткі | 6 | 4 | | 2 | | | |
| 4. | Народная Біблія як феномен традыцыйнай культуры | 4 | 2 | | 2 | | | |
| 5. | Увасабленне народнай маралі і этыкі ў святочнай культуры | 2 | 2 | | | | | |
| 6. | Гендарны аспект традыцыйнай культуры | | | | | | 2 | Рэферат |
| 7. | Сямейныя і каляндарныя святы ў Спісе аб’ектаў НКС | 2 | | | | 2 | 6 | Прэзен-тацыя |
| | Раздзел II. Фальклорныя жанры ў кантэксце святочнай культуры беларусаў | | | | | | | |
| 8. | Песні каляндарных абрадаў | 6 | 4 | 2 | | | | |
| 9. | Песні сямейных абрадаў | 6 | 4 | 2 | | | | |
| 10. | Пазаабрадавыя песні: жартоўныя, прыпеўкі, песні пра каханне, балады | 14 | 8 | 6 | | | | |
| 11. | Славесныя жанры: казкі, легенды, паданні, былічкі | 8 | 8 | | | | | |
| 12. | Малыя славесныя жанры: прыказкі, прымаўкі, замовы, загадкі | 12 | 8 | 2 | 2 | | | |
| 13. | Гульнёва-харэаграфічныя жанры | | | | | | 4 | Прэзен-тацыя |
| | Раздзел III. Акцыянальнасць святочнай культуры беларусаў | | | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 14. | Драматургія народнага мастацтва | 4 | 2 | | 2 | | | |
| 15. | Магічныя практыкі ў святочнай культуры | 4 | 4 | | | | | |
| 16. | Прыгатаванне і ўжыванне абрадавай ежы | | | | | | 4 | Пісьмовае паведамленне |
| 17. | Пераапрананне і маскаванне ў святочнай культуры | | | | | | 4 | Прэзентацыя |
| Раздзел IV. Святочная культура Беларусі XIV–XIX стст. і новага часу | | | | | | | | |
| 18. | Паратэатральныя дзеі шляхецкага саслоўя | 6 | 6 | | | | | |
| 19. | Святочная культура старажытнага горада | 4 | 4 | | | | | |
| 20. | Станаўленне і развіццё савецкіх масавых свят | 2 | 2 | | | | | |
| 21. | Афіцыйны святочны каляндар Беларусі | 4 | 2 | | 2 | | | |
| 22. | Віды і формы сучасных мастацка-відовішчных дзей | 6 | 4 | | | 2 | 6 | Прэзентацыя |
| | | 106 | 76 | 12 | 14 | 4 | 26 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*Беларускі* фальклор: Энцыклапедыя : У 2 т. – Т. 1. – Мінск : БелЭн, 2005. – 768 с. – Т. 2. – 2006. – 832 с.

*Беларускі* фальклор: Жанры, віды, паэтыка. У 6 кн. / Рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) і інш. – АН Беларусь, ІМЭФ. – Мінск : Беларуская навука, 2001–2006.

*Беларусы.* Т. 6. Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў, В. М. Бялявіна, А. У. Гурко і інш.; Рэдкал.: В. М. Бялявіна і інш.; ІМЭФ НАН Беларусь – Мінск : Беларуская навука, 2002. – 606 с.

*Беларусы.* Т. 7. Вусна-паэтычная творчасць / Г. А. Баргашэвіч, Т. В. Валодзіна, А. Гурскі і інш.: Рэдкал. В. М. Бялявіна і інш.; ІМЭФ НАН Беларусь – Мінск : Беларуская навука, 2004. – 586 с.

*Васілевіч, У. А.* Беларускі народны каляндар / У. А. Васілевіч. – Мінск : Ураджай. 1993. – 80 с.

*Грамадскі* быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В.К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 256 с.

*Гульні*, забавы, ігрышчы / склад. А. Ю. Лозка. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 534 с.

*Земляробчы* каляндар: Абрады, звычаі / Рэдкал.: А. С. Фядосік і інш. – Мінск : Навука і тэхніка, 2003. – 405 с.

*Камінскі, А. Я.* Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства : вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў ВНУ па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят / А. Я. Камінскі. – Мінск : БДУКМ, 2011. – 110 с.

*Камінскі, А. Я.* Рэжысура традыцыйнага абраду : вучэбна-метадычны дапаможнік / А. Я. Камінскі. – Мінск : БДУКМ, 2009. – 110 с.

*Кухаронак, Т.* Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 238 с.

*Мальдзіс, А. І.* Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: Нарысы быту і звычаяў / А.І. Мальдзіс. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1982. – 256 с.

*Міфалогія* беларусаў: энцыкладпедычны слоўнік / склад. І. Клімковіч і інш.; навук. рэд. Т. Валодзіна. – Мінск : Беларусь, 2011. – 607 с.

*Народная* культура Беларусі: Энцыкл. даведнік. – Мінск : Бел. навука, 2002. – 432 с.

*Нарысы* гісторыі культуры Беларусі : у 4 т. Т.1: Культура сацыяльнай эліты XIV – пачатку XX ст. / / А. І. Лакотка [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Беларуская навука, 2013. –573 с.

*Нарысы* гісторыі культуры Беларусі : у 4 т. Т. 2: Культура гарадоў X – пачатку XX ст. / [А. І. Лакотка і інш. ; уводзіны, заключэнне: А.І. Лакотка]. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 572 с.

*Нарысы* гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. Т. 3: Культура сяла XIV – пачатку XX ст. – Кн. 2: Духоўная культура / А. І. Лакотка [і інш.]. – Мінск :

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларуская навука, 2016. – 749 с.

*Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў. У 6 т. 10 кн. / Рэдкал.: Т. Б. Варфаламеева (гал. рэд.) і інш.– Мінск : Вышэйшая школа. – 2008–2013.

*Фядотаў, А. Г.* Канфесійныя цырымоніі і святы беларускага горада XVII–XVIII стагоддзяў / А. Г. Фядотаў // Вестник молодёжного научного общества. – Мінск : МНО, 2003. – 106 с.

*Цітоў*, *В. С.* Этнаграфічная спадчына: Беларусь: Традыцыйна-бытавая культура / В. С. Цітоў. – Мінск : Беларусь, 2001. – 207с.

*Чурко*, *Ю.М.* Белорусский хореографический фольклор / Ю. М. Чурко. – Минск : Вышэйшая школа, 1990. – 415 с.

*Дадатковая*

*Аляхновіч*, *А. М.* Веснавыя святы / А. М. Аляхновіч. – Мінск : Ураджай, 2000. – 254 с.

Аляхновіч, *А. М.* Зімовыя святы / А. М. Аляхновіч. – Мінск : Ураджай, 1998. – 134 с.

*Барышев*, *Г. И.* Батлейка / Г. И. Барышев – Мінск : Бел.навука, 1995. – 143 с.

*Барышев*, *Г. И.* Театральная культура Белоруссии XVIII века / Г.И. Барышев. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 293 с.

*Беларуская* міфалогія: энцыклапед. слоўн. / С. Санько і інш. – Мінск : Беттарусь, 2004. – 506 с.

*Беларускія* народныя танцы, карагоды і гульні / Уклад. В. С. Семенякоў. – Мінск : БелСЭ, 1989. –125 с.

*Беларускі* фальклор: хрэстаматыя / склад. К. П. Кабашнікаў і інш. – Мінск : Вышэйшая школа. 1985. – 749 с.

*Бяздоннае* багацце: Легенды, паданні, сказы / Склад. А. І. Гурскі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. – 255 с.

*Валодзіна*, *Т. В.* Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў / Т. В. Валодзіна. – Мінск : Тэхналогія, 1999. – 167 с.

*Гісторыя* беларускага мастацтва: У 6 т. / Рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) і інш.– Мінск : Навука і тэхніка, 1987–1994.

*Грыцкевіч*, *А. П.* Беларуская шляхта / А. П. Грыцкевіч // Спадчына. – 1993. – №1. – С. 11–16.

*Гуд*, *П.А.* Беларускае купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей. – 2-е выд. / П.А. Гуд – Мінск : БДУКМ, 2006. – 137 с.

*Камінскі*, *А. Я.* Зімовыя святы: Зборнік сцэнарна-метадычных распрацовак / А.Я. Камінскі. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2010. – 145 с .

*Крук*, *І. І.* Сімволіка беларускай народнай культуры / І. І. Крук. – Мінск: Ураджай, 2001. – 350 с.

*Кухаронак*, *Т. І.* Свята як этнакультурны феномен у традыцыйным светапоглядзе беларусаў / Т. І. Кухаронак // Проблемы методологии социогуманитарного познания: диалектика и герменевтика. – Мінск : БГУФК, 2009. – С. 124–127.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Лобач, У. А.* Этнаграфія Беларусі: Вучэбна-метадычны комплекс. / У. А. Лобач. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – 328 с.

*Лозка, А. Ю.* Беларускі народны каляндар / А. Лозка. – Мінск : Полымя, 2002. – 237 с.

*Мальдзіс, А.* Як жылі нашыя продкі ў XVIII ст. / А. Мальдзіс – Мінск : Ураджай, 2001. – 178 с.

*Навагродскі, Т. А.* Традыцыі народнага харчавання беларусаў / Т. А. Навагродскі. – Мінск : НІА, 2000. – 112 с.

*Народны* тэатр / [Уклад., уступ, артыкул і камент. М. А. Каладзінскага; рэдкал. В. К. Бандарчык і інш.; – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 512 с.

*Сысоў, У. М.* З крыніц спрадвечных / У. М. Сысоў. – Мінск : Вышэйшая школа. 1997. – 415 с.

*Фядотаў, А. Г.* Свята беларускага пісьменства ў школе / А. Г. Фядотаў. – Мінск : Беларуская навука, 2000. – 56 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананню самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне

Самастойная работа – мэтанакіраваная вучэбная дзейнасць студэнтаў, якая здзяйсняецца пад непасрэдным ці апасродкаваным кіраўніцтвам выкладчыка. Мэтай самастойнай работы студэнтаў з'яўляюцца прафесійныя кампетэнцыі выпускнікоў ВНУ, што дасягаецца праз фарміраванне ў іх кампетэнцый самаадукацыі. Кампетэнтнасны падыход прадугледжвае ўзмацненне практыкаарыентаванасці адукацыйнага працэсу і ролі самастойнай дзейнасці студэнтаў па вырашэнні задач і сітуацый, якія імітуюць сацыяльна-прафесійныя праблемы.

*Задачы:*

– выпрацоўка ў студэнта навыкаў прадуктыўнай дзейнасці, інавацыйна-творчага і культуралагічнага мыслення, пазнавальных здольнасцей;

– паглыбленае вывучэнне дысцыпліны «Святочная культура Беларусі»;

– актывізацыя самаразвіцця і матывацыі самарэалізацыі студэнта.

Самастойная работа студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Святочная культура Беларусі» прадугледжвае выкананне творчых заданняў, рэжысёрскі аналіз масавага свята, фестывалю, абраду, выкананне кантрольных работ, падрыхтоўку рэфератаў, азнаямленне з навуковай, навукова-папулярнай літаратурай, напісанне эсэ.

Асноўныя *формы* арганізацыі самастойнай працы студэнтаў:

– экспрэс-апытанне па прачытанай лекцыі;

– падбор і вывучэнне аўдыёвізуальных крыніц, падрыхтоўка на гэтай аснове прэзентацый, паведамленняў і іншае;

– аналіз навуковых і навукова-публіцыстычных артыкулаў;

– падрыхтоўка да ўдзелу ў навукова-практычных канферэнцыях, творчых паказах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі
вучэбнай дзейнасці студэнтаў

1. Метады вуснай дыягностыкі (апытанне, дыскусіі, аналіз рытуальна-абрадавых комплексаў і каляндарных свят гадавога цыкла, даклады на семінарскіх занятках, канферэнцыях, вусныя залікі і экзамены).

2. Метады практычнай дыягностыкі (удзел у рэпетыцыйным працэсе гульнявой праграмы, абраду, эстрадных нумароў, тэатралізаванага прадстаўлення, свята; выкананне вучэбна-творчых заданняў выкладчыка).

3. Метады пісьмовай дыягностыкі (тэсты, кантрольныя апытванні, кантрольныя работы, пісьмовыя справаздачы па аўдыторных/дамашніх заданнях, рэфераты, публікацыі артыкулаў, дакладаў, курсавыя работы).

4. Інтэрактыўныя метады дыягностыкі (стварэнне мультымедыйнай прэзентацыі па абранай тэме, творчы паказ, ролевыя гульні, выступленне на ўніверсітэцкіх, гарадскіх і рэспубліканскіх сцэнічных пляцоўках з падрыхтаванымі гульнявымі праграмамі, абрадамі, святамі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**СВЯТОЧНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці*
*1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2018. Фармат 60x84 1/16.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. Ул.-выд. арк. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ